*займеў* (Ю. Свірка. Верны крэўнаму брацтву); *Чужое зямлі нам не трэба, / Пачуцці ва ўсіх нас адны: / Мы хочам, каб мірнае неба / Не знала пажараў вайны. / Мы дружбы народам жадаем / І шчырай братэрскай любві* (А. Бачыла. Радзіма мая дарагая). Гісторыя пацвярджае, што беларусы ніколі не вызначаліся грубай агрэсіўнасцю ў стасунках нават з тымі людзьмі, якія да іх адносіліся часам нядобразычліва.

У публіцыстычным дыскурсе тэма беларускай гасціннасці з'яўляецца актуальнай, што пацвярджаюць дадзеныя інтэрнэт-пошукавікоў (больш за 37000 вынікаў на запыт 'гасціннасць беларусаў'). Абвяшчэнне 2014-га года годам гасціннасці, безумоўна, надало актуальнасці гэтай тэме. *"На высокі афіцыйны ўзровень узнята адна з асноўных асаблівасцей нацыянальнага характару. Гасціннасць стала візітнай карткай беларусаў задоўга да аб'яўлення аднайменнага года. Як у англічан спакойнасць, у немцаў – эканомнасць, у японцаў – пунктуальнасць, так у беларусаў – гасціннасць" – адзначае адна з беларускіх газет* [7]. У разважаннях публіцыстаў на тэму беларускай гасціннасці гучаць думкі аб звязаных з гэтай рысай з'явах – захапленне ўсім іншаземным, неабходнасць развіцця турызму ў краіне, эвалюцыя гасціннасці пад уплывам урбанізацыі і тэхнічнага прагрэсу.

**Заключэнне.** Такім чынам, прааналізаваўшы фразеалагізмы, сталыя звароты моўнага этыкету, мастацкі і публіцыстычны дыскурс, мы прыйшлі да высновы, што гасціннасць як рыса беларускай ментальнасці шырока адлюстроўваецца і ў мове. Гэты факт яшчэ раз пацвярджае існаванне глыбокай сувязі паміж мовай і мысленнем пэўнага народа.


Спіс літаратуры:

1. Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы / Склад. Ф. Янкоўскі; Прадм. Д.Я. Бугаёва. – Мінск : Беларуская навука, 2004. – 494 с.
2. Клышка, М.К. Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў / М.К. Клышка. – Мінск : Беларуская навука, 2005. – 592 с.
3. Мажэйка, Н.С. Частотны слоўнік беларускай мовы / Н.С. Мажэйка. – Мінск : Зоркі гор, 2006. – 658 с.
4. Прыказкі пра гасціннасць [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://prykazki.blogspot.com/2014/01/2_26.html. – Дата доступу: 16.01.2015
5. Успенский, Л. Почему не иначе. Этимологический словарь школьника / Л. Успенский. – Москва : АСТ, 2009. – 464 с.
6. Фасмер М. Этимологический словарь русского языка: В. 4-х т. Т.1 – Москва: Прогресс. – 1964. — Т. 1. — 562 с.
7. Шаўко, А. Гасціннасць – наша візітная картка / А. Шаўко // Белорусская Нива [Электронны рэсурс]. – 4 студзеня 2014. – Рэжым доступу: http://www.belniva.by/news_full.php?id_news=64872. – Дата доступу: 19.05.2014.


## МАСТАЦКІ ТВОР НА ЎРОКУ ЛІТАРАТУРЫ: СПАСЦІЖЭННЕ РОДАВА-ЖАНРАВАЙ АДМЕТНАСЦІ


*В.І. Русілка*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*


Для сённяшняй школьнай практыкі вывучэння літаратуры тыповым недахопам з'яўляецца ігнараванне родавай і жанравай спецыфікі літаратурнага твора, прымяненне метадаў і прыёмаў аналізу, якія не адпавядаюць прыродзе канкрэтнага мастацкага тэксту. Гэта істотна ускладняе рэалізацыю асноўнага прынцыпа літаратурнай адукацыі – прынцыпа аналізу мастацкага твора ў яго эстэтычнай спецыфіцы.

Мэтай дадзенай працы з'яўляецца выяўленне і сістэматызацыя аптымальных прыёмаў аналізу твораў розных жанраў на ўроку літаратуры.

**Матэрыял і метады.** У навуковым артыкуле выкарыстаны прыёмы апісальна-аналітычнага метаду, аналіз вынікаў вопытна-эксперыментальнай работы па ўкараненні ў практыку вучэбна-метадычнага комплексу "Беларуская літаратура" ў 8 класе, назіранне за школьнай практыкай і абагульненне.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Першапачатковай прычынай ігнаравання мастацкай спецыфікі твора з'яўляецца неразуменне глыбіннай сутнасці літаратурных родаў і жанраў, інэрцыя мыслення педагога. Нават у метадычных дапаможніках для настаўніка нярэдка прапануецца вывучаць п'есу як звычайны эпічны твор, складаць план лірычнага верша, чытаць яго па страфах і радках (ці нават "па ланцужку") або пераказваць змест, знаёміць з фальклорнымі творамі без уліку іх асаблівасцей менавіта як жанраў вуснай творчасці народа. У час працы над канцэпцыяй рэфармавання літаратурнай адукацыі акадэмік М.А. Лазарук справядліва падкрэсліваў недапушчальнасць такога становішча: "…жанраваму аспекту ў школьным курсе літаратуры не толькі не ўдзяляецца належная ўвага, на жанравыя асаблівасці твора ўвогуле часта глядзяць як на нейкі дадатковы, малазначны штрых да яго характарыстыкі...Між тым якраз у



Рэпазіторый ВДУ

разуменні жанру хаваюцца вельмі важныя сакрэты мастацкай спецыфікі, характару вобразнасці, кампазіцыі твора, сістэмы выяўленчых прыёмаў і сродкаў” [1, 58]. Сапраўды, толькі прызнаючы родавыя і жанравыя асаблівасці твора зыходнай кропкай аналізу, можна пераадолець адрыў формы ад зместу, недаацэнку ролі “мастацкіх сродкаў”, да якіх настаўнік нярэдка звяртаецца ў дадатак да аналізу змястоўнага боку твора.

Адной з асноўных прычын адзначаных недахопаў у школьным літаратурным аналізе з’яўляецца недакладнае разуменне эстэтычнай спецыфікі твораў розных родаў і жанраў і, адпаведна, недастатковая дыферэнцыяцыя метадаў і прыёмаў вывучэння тэкста. Пры гэтым варта падкрэсліць, што аб’ектыўны працэс дыфузіі літаратурных родаў і жанраў не здымае, а толькі ўзмацняе вастрыню праблемы, абцяжарваючы як для настаўніка, так і для вучня вызначэнне ўнутраных законаў, па якіх напісаны твор і якім павінен быць падпарадкаваны яго аналіз. Ды і сам метадычны тэрмін “аналіз літаратурнага твора” з’яўляецца ўмоўным: праца над тэкстам мае хутчэй аналітыка-сінтэтычны характар, бо выдзяленне кампанентаў мастацка-выяўленчай структуры мэтазгодна праводзіць толькі пры пастаянным суаднясенні іх з ідэйнай задумай аўтара і захаванні эстэтычнай цэласнасці твора, яго мікра- і макравобразнай будовы.

Мастацкія творы адрозніваюцца па спосабу адлюстравання рэчаіснасці (знешні ці ўнутраны па адносінах да аўтара свет), спецыфіцы вобразнасці, мастацкай форме, аб’ёме, моўным афармленні, асаблівасцях эстэтычнага ўспрыняцця (перавага эмацыянальнага ці лагічнага кампанента). У адпаведнасці з гэтым метады і прыёмы вывучэння твораў розных літаратурных родаў павінны мець сваю спецыфіку. Заўважым, што менавіта прынцып “пагружэння” ў родавую і жанравую спецыфіку твора ляжыць у аснове канцэпцыі вучэбнага дапаможніка “Беларуская літаратура” для 8 класа, аўтарамі якога з’яўляюцца М.А. Лазарук, В.І. Русілка і І.М. Слесарава.

Для эпічнага твора ўласціва падрабязнае адлюстраванне падзей, людскіх характараў і тых абставін, у якіх яны дзейнічаюць. Эпічны твор паказвае знешні, аб’ектыўны па адносінах да аўтара свет. Пазіцыя аўтара ў эпічным творы знаходзіць дакладнае і часта прамое выяўленне ў аўтарскім апавяданні, у адлюстраванні падзей і характараў. Разгорнуты сюжэт, наяўнасць вобразаў-персанажаў, пераважна празаічная форма, для якой не ўласціва мова метафар, – тыповыя рысы эпічнага твора. У адпаведнасці з гэтым вылучаюцца тры асноўныя цэнтры ўвагі вучняў: падзея, героі твора, аўтар і асаблівасці яго індывідуальнага стылю. Асноўная адзінка аналізу эпічнага твора – эпізод. Эпічныя творы маюць дастаткова разгалінаваную жанравую сістэму, якая складаецца з твораў малой, сярэдняй і вялікай формы: казка, легенда, паданне, навела, аповесць, раман, цыкл раманаў. Пры разнастайнасці жанравых форм агульныя родавыя рысы ў іх пераважаюць, вызначаючы методыку вывучэння твораў.

У ходзе працы над эпічнымі творамі выкарыстоўваюцца наступныя прыёмы: выразнае і каменціраванае чытанне эпізода; вызначэнне прычынна-выніковай сувязі падзей; складанне плана твора і яго асобных закончаных сэнсавых частак; выбарачнае чытанне тэкста (партрэт, пейзаж і г.д.); рознага віду пераказы (падрабязны, сціслы, выбарачны, творчы); састаўленне характарыстык персанажаў; матывацыя учынкаў і высвятленне псіхалагічнага стану герояў. Для стымуляцыі літаратурнай творчасці вучняў можна прапанаваць складанне і расказванне казкі, “дапісванне” сюжэта, разважанне пра далейшы лёс літаратурных герояў.

Лірычныя творы паказваюць рэчаіснасць праз перажыванні аўтара, суб’ектыўны свет асобы. Гэта адзіны род літаратуры, які паказвае самакаштоўнасць звычайных чалавечых пачуццяў, таму ён мае выключнае значэнне для фарміравання эмацыянальнай культуры вучняў. Адсутнасць сюжэту, маналог ад імя лірычнага героя, сціслая афарыстычная форма, пераважна вершаваная мова, насычаная паэтычнымі тропамі, – асноўныя ўласцівасці лірычнага твора, да якога б жанру лірыкі ён ні адносіўся. Пры аналізе верша важна не парушыць яго эмацыянальнай насычанасці, цэласнасці яго вобразных элементаў (адзінага вобраза-перажывання і мікравобразаў: метафар, эпітэтаў, параўнанняў, рытміка-інтанацыйных прыёмаў, сінтаксічных фігур і г.д.). Арганічнымі метадамі і прыёмамі, якія дазваляюць гэтага дасягнуць, з’яўляюцца наступныя: выразнае чытанне; вуснае слоўнае маляванне; выяўленне фактаў біяграфіі паэта, якія леглі ў аснову твора; знаёмства з гісторыяй яго напісання; параўнанне верша і блізкіх да яго твораў музычнага і выяўленчага мастацтва (у тым ліку песень, напісаных на дадзены тэкст, і ілюстрацый да яго); супастаўленне вершаў розных аўтараў на адну і тую ж тэму або вершаў, напісаных адным аўтарам у розны час; параўнанне арыгіналу твора і яго перакладаў на вядомыя вучням мовы; разгорнутае маналагічнае выказванне вучняў паводле афарыстычных радкоў верша. Эфектыўнымі, пры ўмове педагагічна ўважлівага выкарыстання, могуць быць прыёмы,

Рэпазіторый ВДУ

якія стымулююць уласную вершатворчасць вучняў: "дапісванне" апошняга радка альбо страфы верша, напісанне вершаў па зададзенай схеме чаргавання радкоў (трыялет, актава, санет), напісанне вершаў па зададзеных рыфмах ці на прапанаваную тэму.

Драма (ад грэчаскага слова "дзеянне") – род літаратуры, які адлюстроўвае жыццёвыя з'явы праз паказ непасрэднага дзеяння. Асноўныя драматычныя жанры – трагікамедыя, фарс, вадэвіль, сатырычная і лірычная камедыя, гістарычная, сацыяльная, бытавая драма і г.д. Аднак любая п'еса пішацца перш за ўсё для сцэнічнага ўвасаблення, і з гэтага вынікаюць яе родавыя асаблівасці: вострая канфліктнасць дзеяння, дыялагічная форма, выбарачны паказ асобных, самых напружаных эпізодаў дзеяння, дзяленне на акты (дзеі) і сцэны, наяўнасць аўтарскіх рэмарак, насычанасць мовы твора падтэкстам. Ускладняе вучнёўскае ўспрыняцце драмы знешняя адсутнасць аўтарскай пазіцыі, таму асаблівую ўвагу пры чытанні п'есы трэба надаваць аўтарскім заўвагам (рэмаркам). Асноўная метадычная ўмова паўнавартаснага вывучэння драматычнага твора – стварэнне ва ўяўленні школьнікаў сцэнічнага эфекту. Для гэтага мэтазгодна выкарыстоўваць наступныя метады і прыёмы: азнаямленне са сцэнічнай гісторыяй п'есы з выкарыстаннем альбомаў, афіш, тэатральных праграм, фотаздымкаў акцёраў у ролі; аналітычнае чытанне па ролях; складанне рэжысёрскага плана спектакля; стварэнне мізансцэн; распрацоўка эскізаў касцюмаў, грыма і дэкарацый да спектакля і інсцэніроўка асобных эпізодаў п'есы; наведванне тэатра, прагляд спектакля ці тэлеспектакля з наступным напісаннем водгука ці рэцэнзіі.

**Заключэнне.** Такім чынам, вывучэнне літаратурнага тэкста ў яго родавай і жанравай спецыфіцы і сродкамі, якія ёй адпавядаюць, дапамагае спасцігнуць эстэтычную прыроду твора, яго сэнс, змест і форму, зразумець розныя спосабы выяўлення аўтарскай пазіцыі, актывізуе цікавасць да вывучэння літаратуры, яе выхаваўчае і развіваючае ўздзеянне, стымулюе пазнавальную і творчую актыўнасць вучняў.

Спіс літаратуры

1. Лазарук, М.А. Навучанне і выхаванне творчасцю: Педагагічныя роздумы і пошукі / М.А. Лазарук. – Мінск: Народная асвета, 1994. – 200 с.

## СЕМАНТЫКА-ЭСТЭТЫЧНАЕ ПОЛЕ ПАЭЗІІ АНАТОЛЯ КАНАПЕЛЬКІ

*І.В. Саматой*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Сярод творчых індывідуальнасцей пасляваеннага, так званага філалагічнага пакалення, якое прыйшло ў літаратуру ў 60-х гадах мінулага стагоддзя, сваёй адметнасцю і непаўторнасцю вылучаецца постаць віцебскага паэта, перакладчыка, літаратуразнаўцы, лаўрэата абласной літаратурнай прэміі імя У. Караткевіча, педагога, які, на жаль, рана і нечакана пайшоў з жыцця, Анатоля Канапелькі. Паэзія А. Канапелькі – лірычная споведзь чалавека, які па-філасофску імкнецца асэнсаваць гістарычныя падзеі і з'явы з пазіцыі сучаснасці, праз гранічнае эмацыянальнае напружанне выявіць і сумясціць грамадзянскае і асабістае, высокае і будзённае.

Мэтай нашага артыкула з'яўляецца вызначэнне спецыфікі семантыка-эстэтычнага поля (ідэйна-тэматычных, жанрава-стылёвых асаблівасцей) паэзіі А. Канапелькі.

**Матэрыял і метады.** Аб'ектам даследавання сталі зборнікі А. Канапелькі "Зямная сімфонія" (1966), "Сустрэчы" (1979), "Музыка лістапада" (1999), "Жыццё прадоўжыцца ў песні" (2010). Асноўнымі для навуковага аналізу абраны прыёмы канкрэтнага і апісальнага метадаў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Характар творчасці пісьменніка, як вядома, абумоўліваецца яго біяграфіяй. Нарадзіўся А. Канапелька 16 лістапада 1939 года ў мястэчку Расоны Віцебскай вобласці ў сям'і служачага. З першых дзён вайны бацькі знаходзіліся ў партызанскім атрадзе, які дзейнічаў на тэрыторыі Мінскай вобласці. Пасля вайны вучыўся ў СШ №7 г. Полацка, а ў 1956 г. стаў студэнтам філалагічнага факультэта Полацкага педагагічнага інстытута, пазней факультэт перавялі ў Магілёўскі педагагічны інстытут. Пасля заканчэння вучобы ў 1961 г. працаваў дырэктарам школы, з 1968 г. выкладаў гісторыю беларускай літаратуры ў ВДУ імя П.М. Машэрава. Памёр 18 снежня 2002 года.

Вершы пачаў пісаць яшчэ школьнікам. У друку яны ўпершыню з'явіліся ў 1955 годзе ў полацкай газеце "Сцяг камунізму". Аўтар зборнікаў вершаў "Зямная сімфонія" (1966), "Сустрэчы" (1979), "Музыка лістапада" (1999), "Жыццё прадоўжыцца ў песні" (2010). Друкаваўся ў калектыўных зборніках "Дзвіна" (1958), "Калінові мост" (1969), "Беларускі каляндар" (1970), "Матчына слова"



Рэпазіторый ВДУ